УДК: [904.4:303.442.4](476.7)"653/654"

*А. А. Башкоў, А. В. Іоў*

# ДА ПЫТАННЯ АБ ТАПАГРАФІІ І РЭКАНСТРУКЦЫІ СТАРАЖЫТНАГА КАМЯНЦА

*Артыкул прысвечаны пытанням тапаграфіі і рэканструкцыі старажытнага горада Камянец у Брэсцкай вобласці Рэспублікі Беларусь. Падсумаванні зроблены на падставе здабытага археалагічнага і дакументальнага матэрыялу ў выніку прац 1997—2003 гг. Прапанаваны варыянт візуальнай рэканструкцыі абарончых збудаванняў горада.*

*Ключавыя словы: Заходняя Беларусь, абарончыя збудаванні, Камянецкая (Белая) вежа, рэканструкцыя, тапаграфія*

Заходняе беларускае Палессе багата сваей самабытнай гісторыяй і сваім непаўторным культурным каларытам. Яно здаўна дае шырокі фронт для працы этнолагам, фалькларыстам, лінгвістам, антраполагам, гісторыкам. Археалагічнае вывучэнне гарадоў заходняй Беларусі, так сама, мае глыбокую гісторыю і значны фонд накопленага тэарэтычна-практычнага матэрыялу. Пачаўшыся з другой паловы XIX ст., яно прайшло шэраг этапаў і метадалагічных падыходаў. Маюцца грунтоўныя працы па вывучэнню старажытных гарадоў Заходняй Беларусі ў савецкі час: Берасця [Лысенко, 1985], Пінска [Лысенко, 1997], Ваўкавыска [Зверуго, 1975], Гародні [Воронин, 1954], Наваградка [Гуревич, 1981]. Нажаль прыходзіцца канстатаваць адсутнасць, да нядаўняга часу, увагі даследчыкаў да ўнікальнага летапіснага горада Камянца, вядомага нам па летапісных крыніцах з 1276 г. Толькі знакамітая Белая вежа прыцягвала да сябе ў розныя часы ўвагу гісторыкаў, этнографаў, архітэктараў, мастакоў. Напалеон Орда зафіксаваў магутныя абрысы вежы на малюнках. Леў Сяменавіч Паеўскі паспрабаваў паказаць гісторыю гэтага велічнага збудавання ў кантэксце этнаграфічна-краязнаўчага вывучэння рэгіена. Мікалай Пятровіч Авенарыус звярнуўся да гісторыка-архітэктурных асаблівасцяў дадзенага абарончага збудавання. Як састаўная частка сістэмы абарончых збудаванняў валынскіх і беларускіх зямель, разглядалася вежа вядомымі савецкімі даследчыкамі П.А. Раппапортам [Раппопорт, 1952; 1967] і М.А. Ткачовым [Ткачоў, 1977].

Першым з сучасных даследчыкаў, каго зацікавіла праблема археалагічнага вывучэння старажытнага Камянца, стаў А.В. Іоў. У рамках правадзімых разведак у Камянецкім р-не Брэсцкай вобласці ў 1997 г., ім быў закладзены шурф каля вежы для высвятлення наяўнасці культурнага пласта. Нажаль намаганні былі дарэмнымі. Гэта паставіла шэраг пытанняў аб праўдзівасці меўшай месца рэканструкцыі Я. Куліка апублікаванай М.А. Ткачовым і змешчанай у энцыклапедыйным выданні [Энцыклапедыя ..., 1993] (мал. 1).

Для далейшага даследавання старажытнага горада і яго ваколіц была сфармавана Заходне-Палеская археалагічная група ў складзе супрацоўікаў Інстытута гісторыі НАНБ А.В. Іова і А.А. Башкова Даследчыкі паставілі перад сабой мэту — на падставе вывучэння археалагічных крыніц, рэканструяваць аблічча старога горада і прасачыць асаблівасці гістарычнага развіцця гэтага населенага пункта і яго ваколіц. Адразу вымалеўваліся задачы да вырашэння.

1. Лакалізаваць старажытны замак.
2. Вызначыць магчымую гісторыка-тапаграфічную пераемнасць горада з папярэднімі паселішчамі больш ранняга часу.
3. Прасачыць эвалюцыю планіграфіі горада з канца XIII ст.

© А.А. БАШКОЎ, А.В. ІОЎ, 2017



*Мал. 1.* Рэканструкцыя Я. Куліка і М. Ткачова

4. Знайсці і вывучыць культурныя пласты.
5. Рэканструяваць выгляд першапачатковага паселішча і яго абарончых збудаванняў.
6. Даследаваць матэрыяльную культуру горада розных эпох, пачынаючы з канца XIII ст.
7. Абследаваць ваколіцы горада на наяўнасць археалагічных помнікаў і пры абнаружэнні — даследаваць іх.

Грунтоўнае археалагічнае вывучэнне горада і ваколіц распачалося ў 1998 г. Да палявых прац былі далучаны студэнты гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Археалагічныя раскопкі вяліся да 2004 г. [Башкоў, Іоў, 2006].

Першая праблема з якой сутыкнуліся археолагі — гэта шчыльная забудова і камунікацыі на прылеглай да вежы тэрыторыі, а таксама парушэнне культурных пластоў рэстаўрацыйнымі працамі пачатку XX ст. па праекту У.Суслава. У сувязі з гэтым, была абрана тактыка малых раскопаў. Плошча раскопаў вагалася ад 4 да 32 м$^2$. Усяго было ўскрыта 174 м$^2$. Магутнасць культурных напластаванняў дасягала 4 м.

У выніку археалагічнага вывучэння старажытнага Камянца, удалося знайсці і вывучыць культурныя пласты канца XIII — XVIII стст. Быў лакалізаваны старажытны замак авальнай формы прыкладна 40 × 40 м, які знаходзіўся на захад ад вежы (сенняшняя тэрыторыя гімназіі). А.В. Іовым і А.А. Башковым зроблена спроба рэканструкцыі сістэмы абарончых збудаванняў, якая ўяўляла сабой дзве адасобленыя выспы, абнесеныя ірвом і валам. На заходняй выспе размяшчаўся першапачатковы замак, на ўсходняй — вежа [Археалогія ..., 2009]. Гэта былі дзве адасобленыя абарончыя адзінкі, якія хучэй за ўсе, звязваліся драўляным мастком (мал. 2). Яны маглі выступаць як адзінае цэлае, але пры неабходнасці маглі весці ізаляваную барацьбу. Для прыкладу можна ўзгадаць падзеі канца XIV ст., калі замак быў спалены, а вежа так і не скарылася крыжакам.

Аналізуючы археалагічны матэрыял і паслугуючыся логікай і аналогіямі, аўтары прадбачылі існаванне ўяздной брамы ў замак з поўдня. Жылыя будынкі былі размешчаны насупраць брамы з паўночнага боку замкавай пляцоўкі, гаспадарчыя пабудовы — з абодвух



*Мал. 2.* Рэканструкцыя А. Башкова і А. Іова (мал. А. Башкова)



*Мал. 3.* Рэканструкцыя старажытнага Камянца ў музейнай экспазіцыі «Камянецкая вежа» (пав. А. Башкова і А. Іова)

бакоў ад уяздной брамы, а пасярэдзіне пляцоўкі — не забудаваны двор (мал. 3).

Зробленую археолагамі рэканструкцыю абсалютна падцвердзіў план старажытнага Камянецкага замка, датуемы канцом XVIII ст. (мал. 4). Ен быў знойдзены супрацоўнікам Інстытута гісторыі НАНБ А.А. Мяцельскім у 2008 г. у Аддзеле рукапісаў бібліятэкі РАН у Санкт-Пецярбургу [Збор рукапісных мап. Дадатковы вопіс. № 240, арк. 14].

Важным з'яўляецца тое, што зробленая археолагамі ў 2004 г. рэканструкцыя практычна дакладна супадае з пазначанымі на плане элементамі: памеры і форма абарончых збудаванняў, размяшчэнне ўяздной брамы, жылых і гаспадарчых комплексаў. Адзіным гіпатэтычным дапушчэннем, з'яўляюцца самі драўляныя канструкцыі замка. Нажаль матэрыялы раскопак не далі прыкладу захаваных драўляных канструкцый старажытнага Камянца, таму археолагі прапанавалі іх згодна аналогіям, якія вядомыя з раскопак старажытна-беларускіх гарадоў, у тым ліку, горада Бярэсця.

Такім чынам, была даказана непраўдзівасць рэканструкцыі Я.Куліка, змешчаная ў шэрагу спецыяльнай літаратуры, у тым ліку, энцыклапедычных выданнях.

Акрамя таго, у выніку даследванняў было прасочана пашырэнне горада ў пазнейшыя часы ўздоўж вуліц Піўненка, Гогаля, Леніна. На вуліцы Піўненка, каля будынку былога Дома піянераў быў лакалізаваны могільнік XVII — XVIII стст. і прасочаны падмуркі каплічкі гэтага перыяду. Нажаль лакалізаваць месцазнаходжанне царквы «Звеставання», збудаваную Уладзімірам Васількавічам, не ўдалося.

Падчас вывучэння культурных напластаванняў зроблены цікавыя знаходкі: прылады працы, зброя, значная калекцыя манет XVI— XX стст., рэчы паўсядзеннага побыту і упрыгожванні. Унікальнай знаходкай з'яўляецца кафля XVI ст. з партрэтнай выявай маладога чалавека ў сярэднявечнай вопратцы, аналогіі якой вядомы ў нязначнай колькасці на тэрыторыі Беларусі. Матэрыялы перадмацерыковага пласта (керамічны матэрыял) далі сведчанні пра існаванне на месцы старажатнага замка паселішча X ст.

Археалагічныя разведкі, якія праводзіліся А.А. Башковым ў 1998 г. ў басейне р. Лясная, недалек г. Камянца Брэсцкай вобласці, далі нечаканыя вынікі. На правым беразе рэчкі, за межамі горада, паўночна-заходней ад Камянецкай вежы, на ўзвышшы, якая мае мясцовую назву «манастыр», былі знойдзены рэшткі грунтовых пахаванняў. Цікаўнасць выклікала мясцовая лягенда пра існаванне ў старажытнасці манастыра, які падчас маскоўскай навалы пайшоў пад ваду. Верагодней за ўсе трэба атаясамляць гэтую лягенду з падзеямі другой паловы XVII ст., калі войскі ваяводы Івана Хаванскага зруйнавалі мястэчка і спалілі Уваскрасенскі манастыр. Дадзеная інфармацыя паспрыяла пачатку земляных прац на вышэй азначаным месцы [Башкоў, 2003; 2005].

Праца на помніку праводзілась таксама сіламі студэнтаў гістарычнага факультэта БрДУ ў рамках археалагічнай практыкі, прадугледжанай вучэбнымі планамі ВНУ. Штогадовыя археалагічныя даследаванні дадзенай мясцовасці далі наступныя вынікі. Усяго закладзена 5 шурфоў агульнай плошчай 72 м$^2$:




*Мал. 4.* Фрагмент плана Камянца XVIII ст.

у 1998 г. — 4; 1999 — 12; 2000 — 8; 2001 — 24; 2002 — 24 м$^2$. Глыбіня культурнага пласта вагалась ад 22 да 70 см (без уліку ям).

На ускрытай плошчы зафіксавана: 5 цэлых пахаванняў (у чатырох пашкоджаныя чэрапы); 11 пашкоджаных пахаванняў, якія захаваліся ў выглядзе згрупавання костак і чэрапоў. Пяць пахаванняў ідэнтыфікавана як дзіцячыя. Адно з дзіцячых пахаванняў пашкоджана, негледзячы на заглыбленне ў мацерык. Акрамя таго, зафіксаваныя дзве тленныя плямы ад дзіцячых пахаванняў. Па ўсей плошчы раскопу, на рознай глыбіні траплялі адзінкавыя чалавечыя косткі з пашкоджаных пахаванняў.

Пахаванні знаходзіліся на рознай глыбіні, ад 20 да 75 см. Толькі два дзіцячых пахаванні заглыбляліся ў мацерык на 16 і 24 см адпаведна. Арыентацыя касцякоў пераважна заходняя, у некаторых выпадках з невялікім адхіленнем на паўдневы-захад. Толькі адно пахаванне зарыентавана на паўночны-захад. У сямі выпадках зафіксавана палажэнне рук. У адным пахаванні правая на грудзях — левая ўздоўж, адпаведна ў астатніх: на жываце — на жываце, на жываце — на поясе, (страчана) — на поясе, на грудзях — (страчана), на грудзях — на жываце, на грудзях — на жываце.

Толькі ў двух пахаваннях знойдзены суправаджальны інвентар — адзінаццаць фрагментаў бронзавых дэкаратыўных дэталяў на пас, якія знаходзіліся ў раене жывата на касцяку кабеты, і два касцяных гузікі ў раене грудзей на касцяку падлетка (верагодна дзяўчынкі).

Цікаўнасць выклікаюць фрагменты бронзавых дэталяў паса, знойдзеныя ў 2001 годзе. Сярод іх вызначаюцца дзве літыя спражкі і частка крука для зашпільвання. Накладкі таксама літыя, але двусастаўныя. Дэкаратыўная частка, якая спалучалась з тыльнай пласцінай заклепкамі, мацавалась, верагодна, на скураны пас. Аналаг дадзенай знаходке вядомы з пластоў XIV ст. у старажытным Ноўгарадзе [Седова, 1981].

Другая цікавая знаходка — керамічны гаршчок знойдзены на глыбіні 30 см у 2001 годзе сярод згрупавання камянеў. Гаршчок захаваўся амаль поўнасцю. Страчаны толькі невялічкі кавалак венчыку і бакавіны. Папярэдне яго можна аднесці да ўзораў керамікі перыяду XIV—XV стст.

Практычная адсутнасць пахавальнага інвентару, арыентацыя, палажэнне і ўзроўні залягання касцякоў, сведчаць пра неадначасовасць пахаванняў і іх хрысціянскі абрад.

Дарэзаная і ўскрытая плошча раскопаў у 2003 г. і 2004 г. дала нам істотныя ўдакладненні ў вызначэнні асаблівасцяў размяшчэння пахаванняў. Мы можам сення сцвярджаць аб пэўнай сістэмнасці ў пахаваннях. Калі ўсходняя частка камбінаванага раскопу мела сур'езныя пашкожданні праз меўшую месца распашку, то заходняя частка (ускрытая ў 2002—2004 гг.) дае карціну шэраговага размяшчэння пахаванняў, прыкладна на адной адлегласці. Так, на сенняшні дзень можна рэканструяваць 4 шэрагі пахаванняў. Прычым зазначым, што заглыбленне ішло ў бок павелічэння з усходу на захад. І калі пахаванні на ўсходзе прасочаны ўжо на глыбіні 20 см (гэта паўплывала на моцную іх пашкоджаннасць распашкай), то на захадзе пахаванні зафіксаваны ўжо ў мацерынавых ямах на глыбіні да 70 см ад дзеннай паверхні.

Упершыню ўдалося прасачыць два пахаванні ў трунах. Гэта пахаванні двух дарослых людзей, мужчыны і жанчыны з легкім адхіленнем у арыентацыі на паудневы захад. Рукі ў абодвух знаходзіліся ў аднолькавым палажэнні — правая на грудзях, левая на жываце. Менавіта ў галавах гэтых пахаванняў на глыбіні ад 15 см зафіксаваны развалы двух ганчарных гаршкоў, пастаўленых уверх донцам. Усе гэта дало нам магчымасць прасачыць пэўную сістэматызацыю ў пахаваннях, больш поўную карціну самога пахавальнага абраду з выразнымі слядамі трызны.

Чаргавасць дзіцячых і падлеткавых пахаванняў разам з дарослымі ў кожным з шэрагаў могільніка штурхае на думку аб пэўнай сваяцкай прыналежнасці, альбо нават сямейнасці, пахаваных. Аднак правядзенне антрапалагічнага аналізу костных рэштkaў дасць нам значна большую інфармацыю, што, безумоўна, з'яўляецца прыярытэтным накірункам у далейшым вывучэнні могільніка каля г. Камянец.

Такім чынам, даследаванні грунтовага могільніка ва ўрочышчы «манастыр» каля Камянца даюць падставы сцвярджаць аб адкрыцці аданго з першых гарадскіх могільнікаў першай паловы XIV ст. на правым беразе р. Лясная на пўночны захад ад старажытнага гарадзішча і вежы.

Поўныя справаздачы аб выніках археалагічнага вывучэння г. Камянца і яго ваколіцы знаходзяцца ў архіве Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Увесь здабыты археалагічны матэрыял перададзены ў фонды Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея і стаў асновай для экспазіцыі, якая адкрылася ў 2004 г. ў адрэстаўраванай Камянецкай вежы.

У заключэнні адзначым, што праведзеныя археалагічныя даследаванні дазволілі змяніць уяўленні пра тапаграфію і выгляд летапіснага горада Камянца, вывучыць яго матэрыяльную культуру і пахавальны абрад першых жыхароў, а так сама адкрыць новыя старонкі з яго насычанай гісторыі.

*Археалогія* Беларусі. Энцыклапедыя ў двух тамах. — Мн., 2009. — Т. 1. — С. 412—413.
*Башкоў А.А.* Даследаванні грунтовага могільніка ў ваколіцах Камянца ў 1998—2002 гг. // ГАЗ. — Мн., 2003. — № 18. — С. 278—279.
*Башкоў А.А.* Даследаванне грунтовага могільніка XIV ст. каля г. Камянца // ГАЗ. — Мн., 2005. — № 20. — С. 250—251.
*Башкоў А.А., Іоў А.В.* Археалагічныя даследаванні Камянца і ваколіц у 1997—2004 гг. // Камянецкія чытанні: Матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі (Камянец 4 верасня 2005 г.). — Мн., 2006. — С. 14—19.
*Беларуская* энцыклапедыя. Энцыклапедыя археалогіі і нумізматыкі Беларусі. — Мн., 1993. — 702 с.
*Воронин Н.Н.* Древнее Гродно (по материалам археологических раскопок 1932—1949). — М., 1954. — Т. 3. — 239 с.
*Гуревич Ф.Д.* Древний Новогрудок: пасадско-окольный город. — Л., 1981. — 159 с.
*Зверуго Я.Г.* Древний Волковыск (X—XIV вв.). — Мн., 1975. — 144 с.
*Лысенко П.Ф.* Берестье. — Мн., 1985. — 399 с.
*Лысенко П.Ф.* Древний Пинск XI—XIII вв. — Мн., 1997. — 172 с.
*Раппопорт П.А.* Волынские башни // МИА. — 1952. — № 31. — С. 202—223.
*Раппопорт П.А.* Военное зодчество западнорусских земель X—XIV вв. — Л., 1967. — 242 с. (МИА. — № 140).
*Седова М.В.* Ювелирные изделия древнего Новгорода X—XV вв. — М., 1981. — 196 с.
*Ткачоў М.А.* Замкі Беларусі XIII—XVII стст. — Мн., 1977. — 82 с.

*А. А. Башков, О. В. Іов*

## К ВОПРОСУ О ТОПОГРАФИИ И РЕКОНСТРУКЦИИ ДРЕВНЕГО КАМЕНЦА

В статье на основе результатов археологических исследований 1997—2003 гг. дан вариант реконструкции древнего замчища в г. Каменец Брестской области Республики Беларусь и сделаны выводы относительно топографии старого города. Представлены так же материалы грунтового городского могильника.

К л ю ч е в ы е  с л о в а: Западная Беларусь, оборонительные сооружения, Каменецкая башня, реконструкция, топография.

*A. A. Bashkou, O. V. Iou*

## THE ISSUES OF OF TOPOGRAPHY AND THE RECONSTRUCTION OF THE OLD KAMIENIEC

On the basis of the results of archaeological research in the 1997—2003, authors represents reconstruction of Kamieniec hill-fort(situated in Brest region, Belarus) and draws conclusions about the topography of the Old town. In the article presented also the material of the city grave fields.

K e y w o r d s: Western Belarus, fortifications, Tower of Kamieniec, reconstruction, topography.

*Одержано 13.04.2016*